**Аляхновіч А.М.,**
дацэнт

## РОЛЯ ІНТАНАЦЫЙ У АВАЛОДАННІ НАРОДНАЙ МАНЕРАЙ СПЕВАЎ БУДУЧЫМІ РЭЖЫСЁРАМІ

1. У дадзеным кантэксце тэрмін «інтанацыя» ўжываецца ў сэнсе семантычнага элемента народнай манеры спеваў, які мае адносна самастойнае в ы р а з н а е значэнне. Інтанацыя -- важнейшая эстэтычная і музычна-тэарэтычная катэгорыя, якая знайшла сваё канцэптуальнае адлюстраванне ў вядомым заключэнні Б.Асаф'ева: « ...думка, каб выявіцца у гуках, становіцца інтанацыяй, інтануецца». Можна зрабіць выснову, што працэс інтанавання народнай песні -- гэта праяўленне чалавечай свядомасці ў народных спевах.

2. Па-за інтанаваннем немагчыма існаванне іншых сродкаў народнай манеры спеваў: тэмбру, гармоніі, рытму, дыялектаў, дыхання і інш. Такім чынам, яно мае універсальнае значэнне для фальклорных спеваў. Песенныя інтанацыі — вынік працяглага гістарычнага развіцця, таго жыццёвага укладу, у якім яны ўзніклі, шліфаліся і дайшлі да нашага часу. Разам са зменай бытавых умоў змяняецца і інтанацыйны слоўнік (па тэрміналогіі Б. Асаф'ева) грамадства, яго слыхавыя ўяўленні. Народная песня больш устойліва да змен у жыцці грамадства, але ў ёй адбываюцца пераасэнсаванні інтанацыі, сутнасць якіх заключаецца не ў механічным пераносе пэўных меладычных элементаў з адной эпохі ў другую, а ў спалучэнні старых і новых інтанацый, узнікненні на іх аснове музычных сугуччаў, характэрных ужо для новага часу.

3. Гутарковая і музычная мовы маюць уласцівыя ім інтанацыі. Але музычная інтанацыя адрозніваецца ад моўнай карэнным чынам. У музыцы «тон», «тоннасць» звязаны з якасцю інтэрвала, як суадносінамі паміж гукамі рознай вышыні, якія пры выкананні патрабуюць пэўнага напружання. Менавіта якасць інтэрвала ў народнай песні вызначае эмацыянальны характар інтанацыі. У той жа час інтэрвалы гутарковай мовы адносны ў сваёй вышыні, не так напружаны, як пры спевах. Вызначыўшы якасць інтэрвалаў народнай песні, магчыма перадаць яе інтанацыю, якая ляжыць у аснове народнай манеры спеваў.

4. Што такое народная песня? Гэта лаканічная інтанацыя, якая дзейнічае на кароткай «гукавой прасторы» (Б.Асаф'еў). У народных спевах слухачамі заўсёды заўважалася праўда інтанавання, натуральнасць выканання. Пры народных спевах голас-гук быццам адыходзіць на другі план, саступаючы месца сэнсавай інтанацыі, інтанаванню слова.

5. Стварэнне кожнай народнай песні было абумоўлена жыццёвымі імкненнямі і мела на ўвазе канкрэтныя мэты. Менавіта таму за песнямі пэўнага прызначэння ўстойліва замацаваліся характэрныя папеўкі, якія з'яўляюцца сэнсавым зернем мелодыі, а іншым часам і паэтычным вобразам альбо сюжэтам. Нельга скласці дакладнае ўяўленне аб сэнсавым змесце песні, ігнаруючы яе прызначэнне.

6. Для знаходжання, вывучэння і авалодання інтанацыямі фальклорнай песні, якія ляжаць у аснове народнай манеры спеваў, неабходна вызначыць жанравыя прыметы традыцыйнага твора. Жанр — гэта гістарычны тып мастацкай формы, які абумоўлены яго пэўнай грамадскай функцыяй і адпаведным характарам зместу. Ведаючы спецыфіку асобных устойлівых жанраў, заўсёды магчыма вызначыць сапраўдную прыроду той альбо іншай песні, яе характар і інтанацыю.

7. Са шматлікіх прынцыпаў класіфікацыі народных песень,прапануемых даследчыкамі, лічым мэтазгодным выкарыстаць эстэтычны прынцып, як найбольш устойлівую прымету жанру (Каўпакова Н.П.). У адпаведнасці з гэтым прынцыпам усе песні падзяляюцца на чатыры асноўныя жанры: 1) песні-заклінанні; 2) песні гульнявыя; 3) песні велічальныя; 4) песні лірычныя. У першым выпадку песня заклінае прыроду, лес, прадметы бачнага і нябачнага свету; у другім — пераасэнсоўвае з'явы працоўнай дзейнасці чалавека і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваецца для гульні; у трэцім — велічае чалавека за яго працу, усхваляе яго працоўныя і асабістыя якасці; у чацвёртым — адлюстроўвае эмацыянальныя адносіны чалавека да навакольнага свету, перадае яго радасць, гора, гнеў, крыўду, абурэнне, жартоўныя і сатырычныя погляды на з'явы рэчаіснасці.

8. Аналіз калядных песень паказвае, што іх функцыянальнае прызначэнне звязана з рухамі святочнага шумнага натоўпу, абыходамі двароў калядоўшчыкамі, дзеяннямі калядных персанажаў, інтанацыямі дэкламацыі, скарагаворкамі, танцамі, пантамімай. Менавіта прырода калядак і шчадровак абумоўлівае іх меладычную інтанацыю, у аснове якой — актыўная матор-ная рытміка і элементы моўнага характару з воклічамі, зваротамі, урачыстымі віншаван-нямі, нават заклікамі-загуканнямі, часам уласцівымі для веснавых песень.

9. Для інтанацыі зімовых песень характэрны ў асноўным інтэрвалы квінты. Свабоднае вар'іраванне квінтавых папевак (воклічаў, зваротаў) і перадае характар зімовага свята, і складае інтанацыйна сэнсавае значэнне гэтых твораў. Даследчык Ф.Рубцоў пераканаўча абгрунтоўвае думку аб тым, што святочная квінтавая інтанацыя уласціва многім абрадавым песням славянскіх народаў.

10. Для выканання зімовых песень важна, каб студэнты разумелі іх жанравую прыналежнасць, функцыянальную накіраванасць, прыкладны характар, сувязь з абрадам. Бытавая, абрадавая спецыфіка зімовых песень утрымлівае своеасаблівы «код», «інтанацыйны ключ», які ляжыць у аснове народнай манеры спеваў.

**Ерашэнка С.А.,**
суіскальнік

## ВЫХАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ЗНОСІН СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ

Ролю зносін у жыцці людзей цяжка пераацаніць. Гэта не проста спосаб абмену інфармацыяй паміж людзьмі. Зносіны могуць стаць для чалавека крыніцай радасці, натхнення, душэўнага пад'ёму, але ў той жа час могуць прынесці яму шмат адмоўных эмоцый. Здольнасць да зносін фарміруецца з першых гадоў жыцця, але яе развіццю могуць або садзейнічаць, або мяшаць некаторыя прыроджаныя якасці. Майстэрствам зносін пры жаданні можа авалодаць любы чалавек. Аднак для гэтага неабходны пэўныя ўмовы.

Кожны чалавек у той ці іншай ступені адчувае патрэбнасць у самавыяўленні. Людзям неабходна выказваць свае думкі, пачуцці, перажыванні і абмяркоўваць іх. Эмацыянальная падтрымка вельмі важная для чалавека. Ён заўсёды імкнецца да набыцця адпаведнага эмацыянальнага стану.

Самадзейныя фальклорныя калектывы -- гэта месца духоўных зносін паміж людзьмі, лейтматывам якіх выступае выбраны від мастацтва. У выніку анкетавання ўдзельнікаў некаторых самадзейных калектываў высветлілася, што многія з іх прыходзяць у калектыў, каб сустрэцца з сябрамі на аснове агульнага захаплення. Гэты факт сведчыць аб існаванні дэфіцыту зносін. Аднак «жывым» зносінам перашкаджае цэлы рад пасрэднікаў. Тэлебачанне, радыё, камп'ютэры, прыборы, апараты і іншае абмяжоўваюць магчымасці чалавека ў зносінах.

Адной з прычын існавання праблемы дэфіцыту зносін з'яўляецца, на наш погляд, і няўмельства большасці людзей уваходзіць у кантакт з другім чалавекам.

Шматгадовы вопыт работы з калектывамі мастацкай самадзейнасці, удзельнікамі якіх былі людзі розных прафесій, узростаў і сацыяльных груп, выявіў метадам назірання, размовы, анкетавання цікавыя, на наш погляд, вынікі. У калектывах, дзе прысутнічала здаровая творчая атмасфера, дзе рэпетыцыйны працэс праходзіў у больш свабодным, простым стане, дзе мелі месца калектыўная творчасць і гумар, удзельнікі адзначалі (акрамя развіцця выканальніцкага майстэрства) развіццё навыкаў зносін, такіх як адчуванне свабоды ў зносінах з людзьмі розных сацыяльных груп і ўзростаў, адчуванне ўпэўненасці ў сабе,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ